# История философии

# History of philosophy

*УДК 1(091)(075.8)*

## ФИЛОСОФСКИЕ АСПЕКТЫ ИНТЕРНАЦИОНАЛИЗАЦИИ ОБРАЗОВАНИЯ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ XVI–XVIII вв.

***Д. А. СМОЛЯКОВ***[1), 2)]

[1)]*Институт философии Национальной академии наук Беларуси, ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, г. Минск, Беларусь*
[2)]*Линнаньский педагогический университет, ул. Цуиньцзин, 29, Чикан, г. Чжаньцзян, провинция Гуандун, Китай*

Рассматривается схоластическая основа генезиса и развития отечественного образования в XVI–XVIII вв. с точки зрения процессов интернационализации, в рамках интеллектуального и культурного обмена с Западной Европой. Анализируется параллельный процесс постепенного внедрения экспериментальной методологии в отечественное университетское образование, завершившийся в рамках работы Эдукационной комиссии и реализации идей Просвещения в ходе реформы системы образования Речи Посполитой.

***Ключевые слова:*** интернационализация высшего образования; схоластика; эклектичная философия; Просвещение; межконфессиональная полемика; Вильнюсская иезуитская академия.

***Благодарность.*** Статья подготовлена в рамках работы Белорусско-китайского исследовательского центра философии и культуры, созданного Институтом философии Национальной академии наук Беларуси и Линнаньским педагогическим университетом (г. Чжаньцзян, Китай).

**Образец цитирования:**
Смалякоў ДА. Філасофскія аспекты інтэрнацыяналізацыі адукацыі на беларускіх землях XVI–XVIII стст. *Журнал Белорусского государственного университета. Философия. Психология.* 2019;1:26–33.

**For citation:**
Smaliakou DA. The philosophical aspects of education internationalization on Belarusian territories in XVI–XVIII centuries. *Journal of the Belarusian State University. Philosophy and Psychology.* 2019;1:26–33. Belarusian.

**Автор:**
***Дмитрий Анатольевич Смоляков*** – кандидат философских наук; старший научный сотрудник[1)], научный сотрудник[2)].

**Author:**
***Dzmitry A. Smaliakou***, PhD (philosophy); senior reseacher[a], reseacher[b].
*d.smaliakou@live.com*

# ФІЛАСОФСКІЯ АСПЕКТЫ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ XVI–XVIII стст.

*Д. А. СМАЛЯКОЎ*[1*, 2*]

[1*]*Інстытут філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Беларусь*
[2*]*Лінаньскі педагагічны ўніверсітэт, вул. Цуіньцзін, 29, Чыкан, г. Чжаньцзян, правінцыя Гуандун, Кітай*

Разглядаецца схаластычная аснова генезісу і развіцця айчыннай адукацыі на беларускіх землях у XVI–XVIII стст. з пункта гледжання працэсаў інтэрнацыяналізацыі ў межах інтэлектуальнага і культурнага абмену з Заходняй Еўропай. Аналізуецца паралельны працэс паступовага ўкаранення эксперыментальнай метадалогіі ў айчынную ўніверсітэцкую адукацыю, які завяршаецца ў рамках працы Адукацыйнай камісіі і рэалізацыі асветніцкіх ідэй у галіне рэформы сістэмы адукацыі Рэчы Паспалітай.

***Ключавыя словы:*** інтэрнацыяналізацыя адукацыі; схаластыка; эклектычная філасофія; Асветніцтва; міжканфесіянальная палеміка; Віленская езуіцкая акадэмія.

***Падзяка.*** Артыкул падрыхтаваны ў рамках работы Беларуска-кітайскага даследчыцкага цэнтра філасофіі і культуры, створанага Інстытутам філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Лінаньскім педагагічным універсітэтам (г. Чжаньцзян, Кітай).

# THE PHILOSOPHICAL ASPECTS OF EDUCATION INTERNATIONALIZATION ON BELARUSIAN TERRITORIES IN XVI–XVIII CENTURIES

*D. A. SMALIAKOU*[a, b]

[a]*Institute of Philosophy, National Academy of Sciences of Belarus, 1 Surhanava Street, building 2, Minsk 220072, Belarus*
[b]*Lingnan Normal University, 29 Cunjin Road, Chikan District, Zhanjiang, Guangdong Province, China*

The article observes the scholastic basement of genesis and development of education on Belarusian territories XVI–XVIII centuries in accordance with processes of internationalization in area of intellectual and cultural exchange with Western Europe. There is also investigated the parallel process of experimental methodology implementation into local university education which was completed in framework of Education Commission activities and Enlightenment ideas realization in area of Polish-Lithuanian Commonwealth education system reform.

***Key words:*** internationalization of education; scholasticism; philosophia recentiorum; Enlightenment; inter-confessional polemics; Jesuit Academy of Wilnia.

***Acknowledgements.*** The article prepared in framework of joint activity of Sino-Belarusian Research Center of Philosophy and Culture created by Institute of Philosophy of National Academy of Sciences of Belarus and Lingnan Normal University (Zhanjiang, China).

## Уводзіны

Станаўленне айчыннай вышэйшай адукацыі на пераломе XVI–XVII стст. адбывалася ва ўмовах міжканфесіянальных дэбатаў, якія з'яўляліся не толькі асноўнай формай працякання інтэлектуальнага жыцця ў грамадстве, але і люстрам сацыяльных, палітычных і нават адукацыйных працэсаў у Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ) і Рэчы Паспалітай таго часу. Феномен міжканфесіянальных дэбатаў у ВКЛ будаваўся на ўзорах схаластычнага дыспуту, які шырока практыкаваўся ў тагачасных еўрапейскіх універсітэтах, таму натуральна, што яго з'яўленне супала па часе з вяртаннем на радзіму некалькіх хваль выпускнікоў, агульная колькасць якіх у XIV–XVI стст. дасягала 700 чалавек. Гэта былі выпускнікі ўніверсітэтаў не толькі Кракава, але таксама Прагі, Берліна, Лейпцыга, Вітэнберга, Кёнігсберга, Падуі, Рыма, Балонні, Базэля, Парыжа і нават Лондана і Эдынберга [1, с. 358]. У шырокім сэнсе айчынная палемічная традыцыя стала прамым нашчадкам еўрапейскіх міжканфесіянальных дыспутаў, такіх як Парыжскі дыспут 1240 г., Барселонскі дыспут 1263 г., дыспуты ў Бургасе і Авіле 1375 г., Гейдэльбергскі дыспут 1518 г., Лейпцыгскі дыспут 1519 г.

Адначасова акадэмічны топас функцыянавання і генезісу дыскусійнай культуры Еўропы – не што іншае, як прызнанне схаластыкі ў якасці пажаданага і ўсеабдымнага фармату рэалізацыі сярэднявечнай адукацыі. Пераход ад дыялогавай культуры платонаўскіх твораў да паўнавартаснага дыспуту ў схаластычным разуменні – гэта не толькі пераход стылю і далейшае развіццё лагічных працэдур, але і шырокі спектр акадэмічных і культурных змя-

ненняў, якія забяспечылі сур'ёзны прагрэс у гуманітарных навуках Позняга сярэднявечча. У сувязі з гэтым феномен другой схаластыкі ў беларускім кантэксце можа лічыцца першай сістэмнай спробай пабудовы нацыянальнай сістэмы вышэйшай адукацыі на аснове інтэрнацыяналізацыі. Такі досвед хоць і падаецца перыферыйным, але, па сутнасці, з'яўляецца агульнаеўрапейскім феноменам у межах актыўнасці ордэна езуітаў. Тое, што для Заходняй Еўропы было рэфармаванай, позняй схаластыкай, для беларусаў стала першасным яе вопытам.

У гэтым кантэксце можа падацца заканамерным, што заходняя схаластыка, прыйшоўшы ў XVI ст. на мясцовую глебу, выгадаваную ў рамках візантыйскай традыцыі, выклікала рэлігійна-метадалагічны раскол, які быў аформлены ў выглядзе палемічнай літаратуры. Аднак не сакрэт, што дыялектыка, ці, калі шырэй, арыстоцелеўская логіка, мела моцны ўплыў як на станаўленне заходнееўрапейскай філасофіі, так і на развіццё яе візантыйскай сястры. У гэтым ключы не зусім карэктна супрацьпастаўляць схаластыку і візантыйскую філасофію, калі такое супрацьпастаўленне разглядаецца па-за межамі вялікага расколу і барацьбы за ўладу паміж Папам Рымскім і Патрыярхам Канстанцінопальскім. Разам з тым сапраўдны разрыў фарміраваўся на глебе эксперыментальнай метадалогіі ўнутры самой схаластыкі, які паступова прывёў да змянення акадэмічнага ландшафту айчыннай адукацыі. Уласна, пазначаным праблемам і прысвечаны гэты артыкул.

## Схаластыка як феномен інстытуцыяналізаванай навукі

У межах сярэднявечнай еўрапейскай філасофіі даволі цяжка акрэсліць яе рэгіянальныя адметнасці, паколькі гэта была рэлігійная філасофія, падначаленая хрысціянскай тэалогіі як на Усходзе, так і на Захадзе. У гэтым кантэксце базавай навацыяй схаластыкі, безумоўна, з'яўлялася ўкараненне культуры дыспуту, прытым што візантыйскі акцэнт, а менавіта дыялектыка, заставаўся яе базай, якую далікатна называлі *ars artium*, *scientia rationalis*, *disciplina diciplinarum*, *scientia scientiarum* [2].

Схаластыка ўводзіла і шэраг тэхнічных навацый, якія мелі шырокія культурныя наступствы. У прыватнасці, цяжар доказу ўскладаўся на таго, хто падаваў тэзу, а крыніцы, на якія спасылаўся палеміст, мусілі быць рэлевантнымі і падлягалі ранжыраванню [3, p. 30]. На практыцы ў схаластыцы прыярытэт належаў дакументам, а не звычаям, асабліва ж базай любога доказу рабіліся акты кананічнага ці свецкага права, у той час як чуткі не прымаліся да ўвагі. У сучасным сэнсе схаластыка, як неад'емная частка навучальнага зместу сямі вольных мастацтваў, называлася б заняткамі па лагічных тэхніках.

У Заходняй Еўропе інстытуцыяналізацыя схаластыкі адбывалася ўжо ў XIII ст.: схаластыка стала асновай адукацыйнай праграмы Парыжскага ўніверсітэта. У гэты час дыспут, як эсэнцыяльны элемент адукацыйнай праграмы, выходзіць за межы акадэмічнага асяроддзя, робячыся базавай каштоўнасцю еўрапейскай культуры. Тут «перагляд асноўных тыпаў дыспутаў дазволіў універсітэтам забяспечыць пранікненне схаластычных практык у іншыя сферы культуры, якія не заўсёды заўважаюцца гісторыкамі ўніверсітэцкай адукацыі: паліфанія Нотр-Дама, кантрапункт у мастацтве, мотэты і музычныя палемічныя паэмы (*jeux-partis*) як найбольш культываваныя прафесійнымі выканаўцамі з г. Арас»[1] [4, p. 6–7].

Укараненне схаластыкі ў еўрапейскія сістэмы адукацыі адбывалася пераважна сіламі Дамініканскага ордэна, які за аснову сваёй дзейнасці абраў культывацыю тэалагічных прац з мэтай падрыхтоўкі прафесійных прапаведнікаў [5]. У гэтым ключы ўніверсітэцкая адукацыя рабілася важным складнікам каталіцкай арганізацыі, прытым што ў межах Візантыі гэта было даўняй практыкай [6]. Адметна, аднак, што дамініканцы ў якасці мэты адукацыйнага працэсу абралі не тэалагічныя веды самі па сабе, а палемічныя кампетэнцыі выпускніка. Па сутнасці, дэбаты выступалі і мэтай, і інструментам адукацыі, што ў практычным сэнсе выкарыстоўвалася ў палеміцы каталіцкіх прапаведнікаў з праваслаўем, іўдаізмам і ісламам.

Панаванне схаластыкі супадае па часе са станаўленнем універсітэцкай культуры, а дыспут робіцца галоўным механізмам адукацыі і мэтавай кампетэнцыяй, якую яна пачала даваць у межах усіх чатырох навук. Пры гэтым дыспут меў базавае падабенства з судовым працэсам: у ролі суддзі выступаў выкладчык, які і прымаў рашэнне адносна перамогі таго ці іншага апанента. Прафесійная адукацыя набывала асаблівае значэнне ў межах Рэфармацыі, калі міжканфесіянальная палеміка стала асноўным фарматам інтэлектуальнай актыўнасці тагачаснай Еўропы. У межах Беларусі гэты працэс быў асабліва яркім, бо тут заўважнае месца займалі і візантыйскія сюжэты.

Каталіцкая царква ў рамках контррэфармацыі прыкладала вялікія намаганні для максімальна хуткага прагрэсу ў прасторы філасофска-рэлігійных ведаў. На гэтай глебе адбываецца росквіт мовазнаўства, развіваюцца логіка, рыторыка, юрыспрудэнцыя, новае гучанне набывае гісторыя. Па сутнасці, схаластыка ў гэту эпоху заключаецца ў працэдурныя рамкі, што ператварае яе ў навукападобную

[1]Тут и далей пераклад наш. – *Д. С.*

дысцыпліну. Гэты працэс зарадзіўся ў межах іспанскага залатога веку на фоне вялікіх геаграфічных адкрыццяў і распаўсюдзіўся на ўсю адукацыйную сетку ордэна езуітаў, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі.

У гэтым ключы звычайна вылучаюцца два акадэмічныя стылі, пашыраныя на беларускіх землях у XVI–XVII стст.: заходні, пабудаваны на схаластычных прынцыпах, і ўсходні, рэалізаваны з апорай на візантыйскую філасофію. Хоць у аснове як першага, так і другога стылю ляжала дыялектыка, адрозненне паміж імі заключалася ў тым, што схаластыка ўвяла спаборніцкі прынцып стварэння новых ведаў, а візантыйскі ўзор будаваўся на аснове кампрамісу.

У межах айчыннай палемічнай думкі кадыфікацыя розніцы паміж схаластыкай і візантыйскай філасофіяй стала адной з базавых тэм міжрэлігійнай палемікі. Улічваючы, што дыялектыка з'яўлялася асновай абодвух кірункаў, менавіта дыспут пачаў выступаць у якасці кропкі разрыву традыцый. У гэтым кантэксце дыспут, з'яўляючыся схаластычнай навацыяй, разумеўся каталіцкімі і ўніяцкімі палемістамі як сур'ёзны прагрэс у філасофіі і навуцы, што забяспечваў росквіт канфесіянальных ведаў і ўзвышаў ролю царквы. Адначасова спроба праваслаўных заставацца ў рэчышчы візантыйскай традыцыі ўспрымалася як рэтраградства. З гэтай нагоды ўніяцкі палеміст Л. Крэўза заўважаў: «Калі святло пацямнела, якая ж будзе цемра? На што спадзявацца свецкім, да якіх святло праз духоўных прыходзіць, калі тыя духоўныя ў цемры? Што гэта, калі не пакаранне Божае?» [7, с. 216]. У гэтым плане адыход ад візантыйскай філасофіі ў бок схаластыкі ўспрымаўся ўніятамі як далучэнне да перадавой навукі, пабудаванай на найлепшых узорах Старажытнай Грэцыі, дзе разрабаванне крыжакамі Канстанцінопаля інтэрпрэтавалася як вызваленне дыялектыкі са старога куфра візантыйскай філасофіі.

Пярэчачы Л. Крэўзу, праваслаўны палеміст З. Капыстэнскі звяртаў увагу на тое, што менавіта каталіцкі касцёл адрокся ад еднасці з Канстанцінопалем, а значыць, менавіта ён пакараны на далейшае драбленне ў рамках Рэфармацыі: «Вялікая кара Божая на краіны заходнія пасля адарвання касцёла лацінскага ад царквы ўсходняй наступіла, бо, адышоўшы ад крыніцы веры, адышлі і ад правай мудрасці, адкінулі правыя догмы, а ўзяліся за гэтага свету прыкладныя навукі, ад чаго ў ерасі розныя ўпалі, і самі паміж сабою да вялікай нязгоды прыйшлі, і адзін з іншым у пісьмах адзін аднаму супрацьстаяць» [8, с. 898].

Захад інтэрпрэтаваўся як цэласны філасофскі стыль, дзе Рэфармацыя таксама разглядалася ў межах схаластычнай метадалогіі, а дыспут успрымаўся цэнтральнай прычынай распаду каталіцкай царквы. Абвінавачваючы «лаціннікаў» у тым, што яны, уступаючы ў дыспуты з пратэстантамі, памнажаюць нязгоду ўнутры хрысціянскай царквы, З. Капыстэнскі падкрэсліваў, што «ўся іх мудрасць – на пыху і хвалу пустую і абы для таго, што рабіць, і для прыбытку» [8, с. 899]. У тым жа ключы праваслаўны палеміст Арцемій крытыкаваў пратэстанта С. Буднага: «…пратэстанцкая навука ад чрэва, праваслаўная – ад душы» [9, с. 1294].

Аблуднасць лацінскай адукацыі, на думку праваслаўных палемістаў, заключалася ў тым, што не ўся грэчаская мудрасць перайшла на Захад, а толькі яе элементы. Пад гэтай частковасцю, відавочна, мелася на ўвазе ўсё тая ж дыялектыка. Разам з тым непасрэдна тэалогія Візантыі па вядомых прычынах стала незапатрабаванай на Захадзе, што дазваляла мясцоваму праваслаўю заяўляць пра захаванне аўтэнтычнай веды, накіраванай на духоўнае ўдасканаленне. У сувязі з гэтым схаластыка абвінавачвалася ў бездапаможнасці адносна спасціжэння веры [7, с. 904].

Падобныя негатыўныя ацэнкі ўзнікалі не толькі праз логіку контраргументацыі, але і дзякуючы зменам у мэтавай аўдыторыі адукацыйных інстытутаў. Калі ў ранейшыя часы адукацыйная сістэма была накіравана выключна на падрыхтоўку клерыкальных кадраў, то з часам сітуацыя пачала змяняцца ў напрамку да свецкай адукацыі. Найбольш выразным прыкладам гэтага працэсу можа лічыцца феномен Кёнігсбергскага ўніверсітэта, які ўзнік у выніку секулярызацыі Тэўтонскага ордэна і быў скіраваны на рэалізацыю амбіцый герцага Альбрэхта па пабудове свецкай дзяржавы. У гэтым ключы робяцца зразумелымі закіды палеміста Арцемія ў адрас заходняй навукі: «Блуд ёсць усё лішкавае, ці ў словах, ці ў рэчах. <…> …Душэўны ж блуд – усякая ерась і нячэсце» [9, с. 1204].

Прыкладны характар схаластыкі дазваляў праваслаўным апанентам параўноўваць заходніх філасафаў з фарысеямі. Дыспут вылучаўся ў якасці найбольш небяспечнага элемента заходняй традыцыі, скіраванага на секулярызацыю царкоўнай адукацыі. На той момант царква з'яўлялася як цэнтрам падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, так і найбуйнейшым працадаўцам для іх. У гэтым плане менавіта характар адукацыі робіцца цэнтральным пунктам метадалагічнага і этычнага адрознення паміж візантыйскай філасофіяй і схаластыкай: «Адышла з Грэцыі філасофская мудрасць аб гэтым свеце, але засталася ў ёй правая мудрасць евангельская і прастата святая апостальская і айцоўская. Выхваляюцца рымляне свабодаю панавання свайго паводле свету, і грэкі выхваляюцца свабодаю душы і сумлення свайго, бо правую веру і догматы захоўваюць без усякай узнагароды. Лацціннікі сілагізмы і аргументы вывучаюць, каб спрачацца і адзін аднаго прыпіраць, а грэкі і русы

трымаюць правую веру і даводзяць праўды яе з Пісьма Святога, прытым навучаюцца богаўгодна жыць, адзін аднаго пераўзыходзячы і цесным шляхам ды вузкай брамай праходзячы, тых святых першых хрысціян і пустэльнікаў наследуючы» [8, с. 904].

## Інстытуцыяналізацыя схаластыкі на беларускіх землях

Уздым палемічнай актыўнасці на пераломе XVI–XVII стст. звязваўся не толькі з падпісаннем Берасцейскай уніі, але і з неакрэсленасцю развіцця айчыннай сістэмы адукацыі. У 1570 г. па запрашэнні віленскіх улад езуіты адчынілі першы калегіум, які ў 1578 г. каралём С. Баторыем быўператвораны ў акадэмію. Яна хутка развівалася і ад пачатку ў ёй выкладалі навукоўцы агульнаеўрапейскага маштабу: логік М. Сміглецкі (1564–1618), рыторык С. Ляўксмін (1597–1670), паэт М. Сарбеўскі (1595–1640), гісторык А. Віюк-Каяловіч (1609–1677) [10].

На гэтым фоне адбывалася станаўленне сярэдняй і вышэйшай праваслаўнай адукацыі, звязанай са з'яўленнем брацкіх школ, утвораных па ўзоры езуіцкіх калегіумаў. Такія ўстановы спачатку ўзніклі ў Вільні (1584) і Львове (1585), а затым хутка распаўсюдзіліся на тэрыторыі Беларусі (дзейнічалі ў Магілёве (1590), Брэсце (1591), Мінску (1592)) і Украіны; на пачатку XVII ст. брацкія школы з'явіліся таксама ў Полацку, Пінску, Оршы і Шклове [11]. Апагеем гэтага працэсу стала адкрыццё Кіева-Магілянскай акадэміі – першай праваслаўнай установы вышэйшай адукацыі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

З самага пачатку як каталіцкая, так і праваслаўная адукацыя грунтавалася на традыцыйных цыклах *Trivium* і *Quadrivium* (упор рабіўся на мовазнаўчую праблематыку) і фарміравала схаластычныя кампетэнцыі. У гэтым плане менавіта схаластыка з'яўлялася кропкай генезісу айчыннай сярэдняй і вышэйшай адукацыі і, па сутнасці, феноменам Новага часу, а не Сярэднявечча. У шырокім сэнсе сама міжрэлігійная палеміка на Беларусі па форме свайго працякання была схаластычным праектам, які забяспечыў не толькі ўкараненне новай метадалогіі, але і стварэнне завершанай адукацыйнай сістэмы. Адначасова схаластыка – гэта толькі пачатак, інстытуцыяналізаванае поле, у межах якога генерыравалася новая метадалогія.

## Метадалагічная рэвалюцыя ў схаластычнай прасторы ўніверсітэцкай навукі

У рэчышчы схаластычнай адукацыі Заходняй Еўропы з канца XV ст. пачынае распаўсюджвацца метадалагічны раскол, які традыцыйна звязваецца з творчасцю астраномаў і пазаінстытуцыянальных філосафаў. Калі схаластыка мела вялікія поспехі ў развіцці гуманітарных навук, то развіццё прыродазнаўства, наадварот, стрымлівалася традыцыйнай метадалогіяй, дзе абстрактная дыспутацыя толькі замінала. У гэтым кантэксце набывае вялікае значэнне астраномія, якая з прычыны маштабаў аб'ектаў даследавання дазваляла паўнавартасна выкарыстоўваць метад назірання, абвяргаючы абстрактныя высновы дыялектыкаў і метафізікаў не сілай тэкстуальных крыніц, а фактычнасцю прыродных з'яў.

Навуковая дзейнасць М. Каперніка (1473–1543), а надалей Г. Галілея (1564–1642), І. Кеплера (1571–1630), Ц. Браге (1546–1601) і іншых навукоўцаў спрыяла пранікненню эксперыментальнай метадалогіі ва ўніверсітэцкую адукацыю. У той жа час з'яўляюцца філосафы, якія прапануюць выкарыстоўваць у дачыненні да спасціжэння прыроды новую метадалогію. У трактатах Ф. Бэкана (1561–1626) «Новы Арганон» (*Novum Organum scientiarum*) і Р. Дэкарта (1596–1650) «Развагі пра метад, каб слушна накіроўваць свой розум і адшукваць ісціну ў навуках» (*Discours de la méthode pour bien conduire sa raison, et chercher la verité dans les sciences*) былі зроблены рашучыя спробы адмовіцца ад схаластыкі ў межах натуральных навук, хоць самі гэтыя працы і напісаны ў фармаце палемічных трактатаў. Астраномы, робячы свае адкрыцці, усё яшчэ падводзілі пад іх метафізічную базу, не пагарджаючы містычнай нумералогіяй.

Далейшае развіццё акрэсленых ідэй такімі навукоўцамі, як І. Ньютан (1643–1727), Г. Лейбніц (1646–1716), Э. Галей (1656–1742), ужо адбывалася ў акадэмічным асяроддзі, што ўяўляла сабой новую лінію еўрапейскай адукацыі, якая фарміравалася паралельна са схаластычным мэйнстрымам. У сувязі з гэтым цяжка казаць пра інстытуцыянальную апазіцыю схаластыкі і новай метадалогіі, хоць у філасофскім плане яны, безумоўна, супрацьпастаўляюцца. Па сутнасці, на працягу XVI–XVII стст. эксперыментальная навука з'яўлялася адгалінаваннем універсітэцкай адукацыі, якое спачатку развівалася паралельна з ёй, а потым само стала пануючым фарматам яе рэалізацыі. Калі Р. Дэкарт яшчэ абапіраўся на палемічны апарат і выкарыстоўваў метафізіку, то ўжо І. Ньютан канчаткова прыйшоў да схематычнага доказу матэматычнымі сродкамі. Па сутнасці, ён замяніў абстрактныя развагі канкрэтнымі графікамі і схемамі, што значыла канчатковы разрыў паміж гуманітарным і прыродазнаўчым крылом тагачаснай адукацыі.

У гэтым сэнсе еўрапейская адукацыя рэфармавала свае мэты: перастала ажыццяўляць кантроль над чысцінёй тэалагічных дактрын, засяроджваючыся на паводзінах асобы ці этыцы. У гэтым ключы

змянілася стаўленне да міжрэлігійных дыспутаў, такіх папулярных у мінулую эпоху. З гэтай нагоды Дж. Лок пісаў: «Таму, калі адрозненні паміж сектамі такія згубныя для выратавання душы, то ўжо пралюбадзейства, блуд, нячыстасць, непатрэбства, ідаласлужэнне… і гэтак далей не ў меншай ступені з'яўляюцца справамі плоці… Адпаведна, усё гэта павінна быць выкаранена з не меншым імпэтам і энергіяй» [12, с. 92].

У Рэчы Паспалітай затуханне міжрэлігійных дыспутаў супала не толькі з пераканаўчай перамогай каталіцтва на фоне катастрафічных палітычных падзей, але і азнаменавала сабой пераход інтэлектуальнай павесткі з рэлігіі на палітыку. У новых умовах міжрэлігійныя дэбаты страцілі сваю актуальнасць, бо перасталі адпавядаць патрабаванням грамадства і дзяржавы. Да праўды сказаць, артадаксальнасць праваслаўя выявілася слушнай у дачыненні да ацэнак схаластычнай адукацыі, бо менавіта схаластыка падвяла рысу пад дамінаваннем рэлігіі ў інтэлектуальным жыцці і адукацыйнай сістэме Еўропы.

## *Philosophia recentiorum* і адукацыйная рэформа Рэчы Паспалітай

Ідэі Ф. Бэкана, Р. Дэкарта, Дж. Лока, Б. Спінозы, як і апошнія дасягненні прыродазнаўчых навук, на тэрыторыі Беларусі былі вядомыя яшчэ ў XVII ст., аднак больш як аб'ект схаластычнай крытыкі ў асяродку акадэмічных інстытуцый. Аднак з паступовым падзеннем ролі царквы ўзвышалася роля дзяржаўных органаў кіравання, якія пачалі выкарыстоўваць адукацыю ва ўласных мэтах, што вяло да змен у адукацыйнай парадыгме Рэчы Паспалітай.

Тым не менш зводзіць гэтыя змены выключна да перамогі свецкага над царкоўным не варта. Сама па сабе адукацыйная сістэма выпрацоўвала інтэнцыі да сінтэзу акадэмічных ліній у межах агульнаеўрапейскай навукі – схаластычнай метадалогіі гуманітарных навук і даследчай метадалогіі прыродазнаўства. Ва ўмовах, калі навуковыя дасягненні пачалі даваць вялікі эфект і абумоўліваць эканамічныя і вайсковыя поспехі, еўрапейскія ўніверсітэты не маглі ігнараваць новую метадалогію, бо яна стала запатрабаванай сярод студэнтаў, а самі выкладчыкі ператвараліся ў прамых яе прыхільнікаў. Спробы мадэрнізаваць схаластычны базіс універсітэцкай адукацыі згодна з вынікамі прыродазнаўчых навук выклікалі да жыцця феномен эклектычнай філасофіі, ці *philosophia recentiorum*, якая зрабілася непасрэдным інструментам з'яўлення Асветніцтва.

У Рэчы Паспалітай абстрактнасць падыходаў традыцыйнай схаластыкі на інстытуцыянальным узроўні была пераадолена ў межах *Collegium Nobilium* – першай установы вышэйшай адукацыі ордэна піяраў, заснаванай у 1740 г. С. Канарскім (1700–1773) у Варшаве. Тут глыбока пераасэнсоўваліся творы Г. Лейбніца, Ф. Бэкана, Дж. Лока і Р. Дэкарта з пункта гледжання мэт і задач тагачаснай адукацыі (героі, пералічаныя ў брашуры выкладчыка калегіума А. Віснеўскага «З філасофскіх палажэнняў сучаснай фізікі» (*Propositiones philosophicae ex physica recentiorum*), на старонках якой эксперыментальная фізіка пераадольвала схаластыку) [13, s. 42].

На гэтым фоне на працягу XVIII ст. пад уплывам заходніх філасофаў у Рэчы Паспалітай ствараюцца разнастайныя праекты адукацыйных рэформ. У гэтым кантэксце рэлігійныя дэбаты канчаткова змяняюцца дыскусіяй вакол навуковай метадалогіі, што, як і ў мінулыя гады, мела шырокія наступствы: «З аднаго боку – глыбока мадыфікаваны картэзіянскі рацыяналізм і яшчэ больш папулярны эмпірызм, з другога боку – паглыбленая ў дыдактыку схаластыка, якая змагалася за выключнае панаванне над думкамі і маральнасцю чалавека» [14, s. 430].

Як і міжканфесійная палеміка, гэтыя дэбаты не мелі выключна фармальных наступстваў, але азнаменавалі сабой глыбінную дыскусію вакол метадалогіі даследавання свету людзей і прыроды, антрапалогіі і касмалогіі, пазнання і этыкі. У гэтым рэчышчы рэлігійная адукацыя губляла ўладу, магчыма, над самай галоўнай сваёй функцыяй, а менавіта над выхаваннем як такім.

Новым фокусам гуманітарыстыкі выступілі даследаванні менавіта ў межах навуковай метадалогіі. Напрыклад, А. Скарульскі (1715–1780), рэктар езуіцкіх калегіумаў у Навагрудку, Коўне і Віленскай езуіцкай акадэміі, выдаў у 1755 г. манаграфію «Каментарыі па філасофіі ці логіцы, гэта значыць метафізіцы, агульнай і спецыяльнай фізіцы», дзе нароўні з крытыкай Р. Дэкарта і Дж. Лока падрабязна разбіраў дасягненні прыродазнаўства. У гэтым жа напрамку працаваў С. Шадурскі (1726–1789), выкладчык *Collegium Nobilium* у Варшаве, а таксама навагрудскага, бранеўскага і гродзенскага езуіцкіх калегіумаў. Ён разглядаў праблемы логікі, ісціны ў пазнанні і псіхалогіі з мэтай развіцця прыродазнаўства.

У гэты ж час з'явіўся першы навуковы часопіс *Monitor* (1763–1785), які выходзіў пад рэдакцыяй І. Красіцкага і Ф. Багамольца; другім быў часопіс *Zabawy Przyjemne i Pożyteczne* (1770–1777), які выдаваўся пад рэдакцыяй Я. Альбертранда і А. Нарушэўскага. Дзейнасць гэтых выданняў аказала моцны ўплыў на распаўсюд ідэй як знакамітых навукоўцаў (М. Каперніка, Г. Галілея, Р. Дэкарта), так і новых філасафаў (Ш. дэ Мантэск'ё, Вальтэра, Ж. Ж. Русо) [13, s. 43].

У такой сітуацыі Рэч Паспалітая запусціла рэформу адукацыйнай сістэмы: пачала працу Адукацыйная камісія (1773–1794). Гэты дзяржаўны

орган, па сутнасці, стаў першым у Еўропе правобразам міністэрства адукацыі. Стварэнне Адукацыйнай камісіі адбывалася на фоне ліквідацыі ордэна езуітаў і секулярызацыі яго ўстаноў. У гэтым кантэксце дзяржава нацыяналізавала рэлігійную адукацыйную сістэму, падначаліўшы яе сваім мэтам, а менавіта імплементацыі ідэй Асветніцтва: «Адыход ад схаластыкі, а таксама эмансіпацыя навукі і філасофіі ад тэалогіі і царкоўных уплываў – згодна з планамі рэфарматараў – павінны былі рэалізавацца ў адукацыйнай сістэме. Новая адукацыйная сістэма мусіла стаць рухаючай сілай новых лозунгаў, новых поглядаў, а разам з гэтым і правадніком новых гаспадарчых, сацыяльных і палітычных форм» [14, s. 431].

Нягледзячы на асветніцкі характар дзейнасці Адукацыйнай камісіі, рэальныя рэформы маглі пайсці дыяметральна супрацьлеглым чынам, што ясна бачна на прыкладзе рэарганізацыі Віленскай езуіцкай акадэміі. Прафесары гэтай установы з неспакоем глядзелі на праект віленскага біскупа І. Масальскага (1727–1794), які хацеў аб'яднаць акадэмію з дыяцэзіяльнай семінарыяй ва ўніверсітэт, каб рыхтаваць клірыкаў і педагагічныя кадры для патрэб віленскай дыяцэзіі. Акрамя таго, па прыкладзе школ, падначаленых Кракаўскай акадэміі, універсітэт павінен быў ажыццяўляць нагляд за ўсімі былымі калегіумамі ВКЛ [15, s. 52].

Іншы праект (*Myśli o edukacji i instrukcji w Polszczę ustanowić się mające*) быў сфармуляваны літоўскім пісарам І. Патоцкім (1750–1809) і прадугледжваў пашырэнне прыродазнаўчых дысцыплін ва ўніверсітэце. Пры пазітыўным досведзе яго рэалізацыі гэты праект мусіў распаўсюдзіцца на Кракаўскую акадэмію. Для ўвасаблення гэтай задумы важную ролю адыграў новы рэктар М. Пачобут (1728–1810), астраном і матэматык, намаганнямі якога езуіцкая акадэмія была перабудавана ў фармат свецкай адукацыйнай установы.

У гэты час у Віленскай акадэміі гуманітарныя дысцыпліны развіваліся слаба, перавага аддавалася дакладным навукам і медыцыне. Да 1776 г. праходзілі лекцыі М. Сеніцкага (1740 – ?) па механіцы, а таксама М. Кісялеўскага (1738–1802) па архітэктуры. Выкладчыкі французскай мовы таксама звярнуліся да дакладных дысцыплін: Т. Кундзіч (1747–1829) з 1774 г. займаўся ўніверсітэцкай абсерваторыяй, а Ё. Міцкевіч (1744–1817) стаў прафесарам матэматыкі і вывучаў фізіку пад навуковым кіраўніцтвам М. Пачобута, а ў 1775 г. з ініцыятывы біскупа Масальскага займаўся стварэннем фізічнага кабінета. Уласна астранамічная абсерваторыя (заснаваная Т. Жаброўскім (1715–1758) і падтрыманая М. Пачобутам), фізічны кабінет, батанічны сад і кабінет медыцынскіх прэпаратаў сталі новымі сімваламі Віленскай езуіцкай акадэміі. Адначасова галоўнымі кірункамі навуковых даследаванняў акадэміі сталі астранамічныя назіранні і картаграфаванне мясцовасці.

Такім чынам, са згасаннем рэлігійных дыспутаў ва ўніверсітэцкім асяродку пачынаюць дамінаваць механіка, архітэктура, прыродазнаўства; схаластычныя практыкі замяняюцца астранамічнымі назіраннямі і картаграфаваннем гарадоў. З 1770-х гг. айчынная адукацыя завяршыла схаластычны перыяд сваёй гісторыі, перайшоўшы на пазіцыі прыродазнаўчай метадалогіі, што азначала ў першую чаргу канчатковую секулярызацыю вышэйшай адукацыі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Яноўскі АА, Самусік АФ. Універсітэт Беларусі: асэнсаванне і рэалізацыя яго ідэі ў гісторыка-палітычных рэаліях часу. В: Сальков АП, Яновский ОА, редакторы. *Российские и славянские исследования. Выпуск 7.* Минск: БГУ; 2012. с. 357–370.

2. Abelson P. *The Seven Liberal Arts, a Study in Medieval Culture.* New York: Teachers' College Columbia University; 1906. 150 p.

3. Rescher N. *Dialectics. A Contraversy-oriented approach to the theory of knowledge.* New York: State University of New York Press; 1977. 128 p.

4. Novikoff A. *The Medieval Culture of Disputation. Pedagogy, Practice, and Performance.* Philadelphia: University of Pennsylvania Press; 2013. 336 p.

5. Hinnebusch W. The Dominican Order and Learning [Internet]. 2012 [cited 2018 July 15]. Available from: http://www.dominicans.ca/Documents/articles/Hinnebusch1.html.

6. Constantinides CN. *Higher Education in Byzantium in the Thirteenth and Early Fourteenth Centuries (1204–1310).* Nicosia: Cyprus research Centre; 1982. 222 p.

7. Кревза Л. Оборона унии. В: *Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией. Том 4. Памятники полемической литературы Западной Руси*. Петербург: Типография и хронография А. Траншеля; 1878. с. 157–312.

8. Копыстенский З. Палинодия. В: *Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией. Том 4. Памятники политической литературы Западной Руси*. Петербург: Типография и хронография А. Траншеля; 1878. с. 313–1200.

9. Послания Старца Артемия, XVI века. В: *Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией. Том 4. Памятники полемической литературы Западной Руси*. Петербург: Типография и хронография А. Траншеля; 1878. с. 1201–1448.

10. Косман М. Рэфармацыйная і контррэфармацыйная школьная адукацыя на беларускіх землях Вялікага Княства Літоўскага. У: Косман М. *З гісторыі культуры Вялікага Княства Літоўскага.* Мінск: Медысонт; 2010. с. 226–251.
11. Самусік АФ. Спецыфіка выкладання «septem artes liberalis» у айчынных брацкіх школах у канцы XVI – першай трэці XVII ст. *Вышэйшая школа.* 2016;2:57–60.
12. Локк Дж. *Сочинения. Том 3.* Субботин АЛ, редактор. Москва: Мысль; 1988. 668 с.
13. Tonacki B. Filozoficzne podstawy działalności komisji edukacji narodowej przykładowej działalności. *Czasopismo Filozoficzne.* 2006 wrzesień;1:41–51.
14. Kaliszewski W. Między scholastyką i Oświeceniem (Agnieszka Smolińska. *Dyskurs oświeceniowy. Filozofia ks. Antoniego Jakuba Wiśniewskiego Schp (1718–1774)*. Kraków: Towarzystwo Autorów I Wydawców Prac Naukowych «Universitas»; 2012). *Napis. Pismo poświecone literaturze okolicznościowej i uztkowej*. 2013;19:430–434.
15. Kamińska J. Akademia Wileńska 1773–1780. *Rozprawy z dziejów oświaty*. 1997;38:51–68.

## References

1. Yanouski AA, Samusik AF. [The university of Belarus: understanding and realization of its ideas in the historical and political realities of the time]. In: Sal’kov AP, Yanouski AA, editors. *Rossiiskie i slavyanskie issledovaniya. Vypusk 7* [Russian and Slavic studies. Scientific Bulletin. Issue 7]. Minsk: Belarusian State University; 2012. p. 357–370. Belarusian.
2. Abelson P. *The Seven Liberal Arts, a Study in Medieval Culture.* New York: Teachers’ College Columbia University; 1906. 150 p.
3. Rescher N. *Dialectics. A Contraversy-oriented approach to the theory of knowledge.* New York: State University of New York Press; 1977. 128 p.
4. Novikoff A. *The Medieval Culture of Disputation. Pedagogy, Practice, and Performance.* Philadelphia: University of Pennsylvania Press; 2013. 336 p.
5. Hinnebusch W. The Dominican Order and Learning [Internet]. 2012 [cited 2018 July 15]. Available from: http://www.dominicans.ca/Documents/articles/Hinnebusch1.html.
6. Constantinides CN. *Higher Education in Byzantium in the Thirteenth and Early Fourteenth Centuries (1204–1310).* Nicosia: Cyprus research Centre; 1982. 222 p.
7. Krevza L. [The defense of the union]. In: *Russkaya istoricheskaya biblioteka, izdavaemaya Arkheograficheskoi komissiei. Tom 4. Pamyatniki polemicheskoi literatury Zapadnoi Rusi* [Russian Historical Library published by the Archeographical Commission. Volume 4. Monuments of polemical literature of Western Russia]. Saint Petersburg: Tipografiya i khronografiya A. Transhelya; 1878. p. 157–312. Old Belarusian.
8. Kopystenski Z. [Palinody]. In: *Russkaya istoricheskaya biblioteka, izdavaemaya Arkheograficheskoi komissiei. Tom 4. Pamyatniki polemicheskoi literatury Zapadnoi Rusi* [Russian Historical Library published by the Archeographical Commission. Volume 4. Monuments of polemical literature of Western Russia]. Saint Petersburg: Tipografiya i khronografiya A. Transhelya; 1878. p. 313–1200. Old Belarusian.
9. [The Epistle of the Elder Artemiy, XVI century]. In: *Russkaya istoricheskaya biblioteka, izdavaemaya Arkheograficheskoi komissiei. Tom 4. Pamyatniki polemicheskoi literatury Zapadnoi Rusi* [Russian Historical Library published by the Archeographical Commission. Volume 4. Monuments of polemical literature of Western Russia]. Saint Petersburg: Tipografiya i khronografiya A. Transhelya; 1878. p. 1201–1448. Old Belarusian.
10. Kosman M. [Reformation and Counterreformation school education in the Belarusian lands of the Grand Duchy of Lithuania]. In: Kosman M. *Z gistoryi kul’tury Vjalikaga Knjastva Litowskaga* [From the history of Grand Duchy of Lithuania]. Minsk: Medysont; 2010. p. 226–251. Belarusian.
11. Samusik AF. [The Specifics of teaching «septem artes liberalis» in the local fraternal schools in the end of the XVI – the first third of the XVII century]. *Vyshjejshaja shkola*. 2016;2:57–60. Belarusian.
12. Locke J. *Sochineniya. Tom 3* [The works. Volume 3]. Subbotin AL, editor. Moscow: Mysl’; 1988. 668 p. Russian.
13. Tonacki B. [Philosophical bases for the activities of the National Education Commission activities]. *Czasopismo Filozoficzne.* 2006 wrzesień;1:41–51. Polish.
14. Kaliszewski W. Między scholastyką i Oświeceniem (Agnieszka Smolińska. *Dyskurs oświeceniowy. Filozofia ks. Antoniego Jakuba Wiśniewskiego Schp (1718–1774)*. Kraków: Towarzystwo Autorów I Wydawców Prac Naukowych «Universitas»; 2012). *Napis. Pismo poświecone literaturze okolicznościowej i uztkowej*. 2013;19:430–434. Polish.
15. Kamińska J. [The Academy of Vilnius 1773–1780]. *Rozprawy z dziejów oświaty*. 1997;38:51–68. Polish.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 31.08.2018.*
*Received by editorial board 31.08.2018.*